Паляшчук Г. А.

Тэма: Праблема маральнага выбару на вайне

(па аповесці Васіля Быкава “Жураўліны крык”)

Мэты: дапамагчы вучням адчуць і зразумець трагічнасць і велічнасць лёсу герояў аповесці “Жураўліны крык”;

ствараць умовы для фарміравання ўменняў вучняў характарызаваць герояў твора на аснове прачытанага; удасканальваць уменне працаваць над праектам; развіваць уменні аналізаваць учынкі і паводзіны герояў;

спрыяць выхаванню пачуццяў грамадзянскага абавязку і чалавечай годнасці.

Форма урока: абарона праекта.

Метады: даследчы, ілюстрацыйны, эўрыстычны.

Эпіграф: “Ёсць дзве формы жыцця: гарэнне і гніенне. Смелыя і мужныя выбіраюць першую. Баязлівыя і скупыя – другую” (Максім Горкі).

Ход урока

І. Арганізацыйна-матывацыйны этап.

Слова настаўніка

75 год прайшло з дня заканчэння Вялікай Айчыннай вайны, але і да гэтага часу вялікім болем адгукаецца вайна ў кожнай сям’і. Вайна прынесла смерць і пакуты мільёнам людзей. Наш абавязак помніць пра трагедыю вайны, помніць пра гераізм і мужнасць тых, хто змагаўся з ворагам і ратаваў Радзіму.

Тэма вялікай айчыннай вайны ў беларускай літаратуры з’яўляецца адной з галоўных.

Аповесць “Жураўліны крык” таксама пра вайну. Пра маральнае аблічча чалавека на вайне. Пісьменнік раскрывае унутраную сутнасць розных людзей, якіх абставіны паставілі перад выбарам – жыццё ці смерць, змаганне ці здрада.

Паслухайце верш Анатоля Вярцінскага “”Яшчэ невядома, хто болей жывы…” (чытае падрыхтаваны вучань).

Яшчэ невядома, хто болей жывы,
а хто яшчэ мёртвы болей,
хто паў, не схіліўшы галавы,
ці выжыў цаной хто любою.

А зрэшты, вядома, вядома здаўна,
Насмерць хто стаяў за край родны,
хто чашу ахвярную выпіў да дна –
па праву той бессмяротны.

Смерць смерцю адважнай асіліў герой
Імя яго ззяе пачэсна.
А тым, хто пакінуў па-здрадніцку строй,
няма ў бессмяротнасці месца.

II. Паведамленне тэмы, мэты ўрока.

Тэма нашага ўрока … . Нам неабходна зразумець сутнасць мужнага характару адных герояў твора і маральнае падзенне другіх.

Прачытайце эпіграф да ўрока. Як вы разумееце сэнс выказвання?

Клас быў падзелены на тры групы, кожная з якіх рыхтавала сваю частку праекта (характарызавала герояў, вызначала іх жыццёвыя пазіцыі).

Нагадаю, што характарыстыка герояў давалася паводле наступнага ***плана:***

1. Партрэт.
2. Звесткі з даваеннага жыцця.
3. Адносіны да абавязку.
4. Адносіны да іншых герояў.
5. Адносіны іншых герояў да яго.
6. Аўтарскія адносіны.
7. Маральны выбар героя.

III. Прэзентацыя і абарона праектаў.

- Перш чым паслухаем вашы выступленні, адкажыце на пытанні:

♦ У які час пераносіць нас аўтар?

♦ Дзе адбываецца дзеянне?

♦ Што характэрна для быкаўскага паказу падзей ?

♦ Шасёра байцоў атрымалі заданне прыкрыць адступленне свайго батальёна на суткі. Якія пачуцці агарнулі іх у гэты момант?

Настаўнік. Шасцёра байцоў апынуліся на мяжы жорсткіх выпрабаванняў, цяжкага маральнага выбару. Якім ён будзе? Хто нават у складаных умовах зможа захаваць чалавечае аблічча? Што пераважыць: жыццё ці смерць, здрада ці змаганне да апошняй кроплі крыві за Радзіму?

Сімвалічна, што чыгуначны пераезд, дзе разгортваюцца падзеі, разам з гасцінцам утвараюць скрыжаванне. Гэта не толькі магчымасць для герояў твора выбраць той ці іншы шлях, гэта яшчэ і магчымасць зрабіць свой унутраны выбар.

На ўсе пытанні паспрабуеце адказаць на працягу ўрока ў ходзе прэзентацыі вашых праектаў.

(Пасля разгляду кожнага праекта настаўнік задае вучням класа пытанні для разважання над вобразамі герояў).

Праект 1 групы "Хто не спытаў хоць раз трывогі, жыццю не ведае цаны…"

Кіраўнік групы. Наш праект **"Хто не спытаў хоць раз трывогі, жыццю не ведае цаны…"** прысвечаны такім героям, як Барыс Фішар і Рыгор Карпенка.

З першых старонак аповесці відаць, што гэта абсалютна розныя людзі: Барыс Фішар – інтэлігент, сын адукаваных бацькоў, Рыгор Карпенка - армейскі служака, родам з вёскі. Але гэта і выклікала нашу цікавасць.

У кожнага з герояў ужо была акрэсленая жыццёвая пазіцыя. Як праяўляюць сябе героі ў экстрэмальнай сітуацыі? Якім будзе іх выбар?

Выступленні вучняў

Пытанні для разважання:

♦ Ці мог Фішар застацца жывым? (Ён, магчыма, адзіны з усіх герояў, хто мог паспрабаваць выжыць у той ліхаманцы: мог стаіцца. Але не зрабіў гэтага. Безумоўна, адзіны забіты ім немец мала ў чым дапамог яго сябрам на пераездзе, але ён зрабіў для іх усё, на што толькі быў здатны. Для Фішара гэта была першая ў жыцці сапраўдная перамога, перш за ўсё перамога над сабой.).

♦ Які выбар робіць Карпенка? (Ён робіць так, як павінен рабіць кожны сапраўдны вайсковец – да канца, цаною свайго жыцця абараняць Радзіму ад ворагаў).

Кіраўнік групы. І Фішар, і Карпенка зведалі нямала трывог, яны, такія розныя, сустрэліся і ўзбагацілі духоўны свет адзін аднаго. Той апошняй раніцай героі зведалі сапраўдную цану чалавечага жыцця…

Фізкультхвілінка

Праект 2 групы "Жыццё – выпрабаванне чалавека на чалавечнасць"

Кіраўнік групы. Наш праект **"Жыццё – выпрабаванне чалавека на чалавечнасць"** прысвечаны такім героям, як Алік Аўсееў і Іван Пшанічны. Да свайго праекта мы падабралі эпіграф (гэта словы Анатолія Балуценкі), які, на нашу думку, лепш за ўсё адлюстроўвае яго тэму.

У кожнага ёсць добрыя намеры,
Як людзі толькі пачынаюць жыць,

У іншых душах чарнаты без меры.
Адкуль жа ўдаецца зло набыць?

Перад намі два здрадніка,але да здрады кожны з іх прыйшоў па-рознаму. Як? Каб адказаць на гэтае пытанне, прапануем яшчэ раз прайсці жыццёвымі шляхамі Аўсеева і Пшанічнага.

Выступленне вучня

Кіраўнік групы. Такім чынам добры і светлы, поўны надзей юнак Пшанічны становіцца злосным, мярзотным, перайначыць сябе ён ужо не мог і каціўся ўсё болей туды, куды гнала яго крыўда і злосць. Па якіх прынцыпах ён пачынае жыць? Толькі сам сабе, сам для сябе. Свая кашуля бліжэй да цела, а жыццё – даражэй за ўсё, і захаваць яго можна толькі тады, калі кінуць зброю і здацца ў палон немцам.

Такім стаў выбар Пшанічнага, але ён не зразумеў толькі аднаго: мінулае засталося адрэзаным на парозе той старожкі, а наперадзе будучыні не было. Немцы застрэлілі Пшанічнага. І апошняя думка, што пранеслася ў яго галаве, была аб тым, што ён ашукаў сам сябе.

Пытанне для разважання:

♦ Ці мог выбар Пшанічнага быць іншым?

Кіраўнік групы. Зусім па-іншаму выглядае здрада Аліка Аўсеева. Што ўяўляе сабой гэты герой аповесці?

Выступленне вучня

Кіраўнік групы. На жаль, ні Пшанічны, ні Аўсееў не прайшлі выпрабаванне на чалавечнасць.

Праект 3 групы “Апошні крык жураўля…”

Кіраўнік групы. Наш праект пад назваю **“Апошні крык жураўля…”** прысвечаны такім героям, як Васіль Глечык і Віцька Свіст.

Да свайго праекта мы падабралі наступны эпіграф:

Салдат, нібыта журавель,
Увесь час імкнецца да нябёсаў.
Нязгаснай зоркаю жыве
У нашых сэрцах, нашых лёсах…

Алена Лянок

Васіль быкаў прыйшоў у літаратуру, адчуваючы абавязак расказаць пра тое, як нялёгка далася перамога, якія намаганні мільёнаў людзей спатрэбіліся для таго, каб здабыць яе ў агні цяжкіх баёў. У сваіх творах ён паказаў салдат і маладых афіцэраў на перадавой, ва ўмовах маральнага выбару.

Яго героі – самыя звычайныя людзі. Вось як Васіль Быкаў піша ў артыкуле “Жывыя – памяці мёртвых”: “Гэта ён, радавы вялікай бітвы…”. Чытаеш

гэтыя радкі – і міжволі перад вачыма паўстаюць героі “Жураўлінага крыку” Глечык і Свіст.

Выступленне вучня

Пытанне для разважання:

♦ Прашто марыў Свіст той апошняй для яго ноччу? Аб чым быў апошні крык жураўля-Свіста?

Кіраўнік групы. Адзін за адным, быццам журавлі, адляцелі ў безыменную далячынь быкаўскія героі. Пакуль на кароткі час застаўся толькі алдзін – Васіль Глечык… Самотны, маладзенькі, неабстраляны навічок, радавы “са свежымі, сумнымі вачыма…”

Выступленне вучня

Кіраўнік групы. І Глечык, і Свіст зрабілі свой выбар – цаною свайго жыцця баранілі Радзіму ад ворага.

Шасцёра ўдзельнікаў вайны апынуліся ў надзвычай складаных трагічных абставінах, яны паўсталі перад выбарам: мужнасць ці здрада, жыццё ці смерць. І кожны з іх зрабіў свой маральны выбар.

Настаўнік. Пра каго ж застанецца памяць сярод жывых?

Інсцэніроўка

Вядучы. Памяць. Памяць жывая, і памяць застаецца пра тых, хто змагаўся..

Карпенка (выходзіць). Так, значыць, Пшанічны ўцёк. Недагледзеў нечага ў чалавеку. А паглядзіце, як Фішар абараняўся! Таксама не зразумеў поўнасцю я гэтага чалавека. Адно хачу сказаць: трэба даверяць чалавеку, верыць у яго. І старацца гэта рабіць як найхутчэй, пры жыцці. Веру ў Свіста. Сапраўдны баец, хоць і меў у жыцці памылкі. (Застаецца стаяць.)

Вядучы. Запомнім: Баец Фішар!

Фішар (выходзіць наперад). Адчуваю сябе салдатам, бо выканаў свой абавязак да канца. І яшчэ зразумеў: і тыя геніі, штот стваралі мастацтва вечнага – і Мікеланджэла, і Чэліні, і Верашчагін – у свой час браліся за шпагу, мушкетон ці вінтоўку і наступалі на ворагаў. Відаць, барацьба за права жыць была вышэй за мастацтва, і ёй, пэўна, суджана перажыць яго. (Застаецца стаяць.)

Вядучы. Запомнім: Баец Свіст!

Свіст. Эх, позна-позна, і так рана-рана! Не так жыў! Многа памылак зрабіў! Каб давялося зноў пачаць жыць, увесь час змагаўся б з подласцю людской. Змагаўся б за чалавека. (Застаецца стаяць.)

Вядучы. Запомнім: баец Глечык!

Глечык. Мама! Родная! Перад табою я заўжды ў даўгу. Неразумны быў, не зразумеў цябе. З дому ўцёк, з роднага дому! Ты прыехала мяне шукаць, прасіла вярнуцца, а галоўнае , - не крыўдаваць, але я маўчаў, не адказваў на пісьмы. Я ж ведаў, што патрэбны там, у родным доме, але былая крыўда не давала забыцца на яе. Які ж неразумны быў! Не цаніў самага дарагога! (Застаецца стаяць.)

IV. Падвядзенне вынікаў.

Настаўнік. Мы паслухалі ўсе тры праекты.

♦ Чаму навучылі вас героі пісьменніка?

Настаўнік. Давайце аб'яднаем асобныя групавыя праекты ў адно цэлае пад назвай "Птушкам – воля, а чалавеку – мір". Як птушкам патрэбна воля, так і людзям паірэбенн мір. Давайце будзем берагчы мір і помніць, якой цаной далася нам перамога.

♦ Які след пакінула праробленая праца ў вашай душы?

V. Рэфлексія.

Настаўнік. Усе героі аповесці "Жураўліны крык" загінулі. Праўда, па-рознаму: хто гераічна, а хто і ганебна. Ці прадказальны быў такі фінал жыцця нашых герояў?

VI. Дамашняе заданне. Выберыце той вобраз-персанаж, які найбольш уразіў вас, і напішыце яму ліст ад сябе, ад імя сваіх сучаснікаў, выкажыце ў ім уласныя адносіны да героя твора, да яго ўчынкаў.